Источник: "Настаўніцкая газета" - 2025-03-28

# Чароўны фармат

**Для тых, каго цікавяць неверагодныя гісторыі, ёсць магчымасць прыняць удзел у казачным праекце.**

Паўдзельнічаць у дзіцячым конкурсе выканальнікаў беларускай казкі могуць юныя аматары прыгод і цудаў ва ўзросце да 17 гадоў. Конкурс ладзяць НАН Беларусі, аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. Прымеркаваны конкурс да IV Міжнароднага форуму даследчыкаў беларускай казкі, які пройдзе ў Мінску сёлета 15—17 мая.



Да пачатку работы форуму журы падвядзе вынікі конкурсу і вызначыць пераможцаў. Калі ў Мінску збярэцца форум, на ім прадставяць лепшыя ролікі, а пераможцы атрымаюць узнагароды. І яшчэ — сертыфікаты на ўдзел у праграме для дзяцей і падлеткаў "ДНК. Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя" на канале "Культура" Беларускага радыё.

**Іван ЖДАНОВІЧ.**

**Малюнак Максіма Дрыго — з кнігі казачніка Яўгена Калашнікава "Сказки гномика Макара".**

Іван Ждановіч. Чароўны фармат